УДК 631.582 : 631.51 : 631.8

С. В. ШЫНГАРОВА

УПЛЫЎ ПРЫЁМАЎ ПЕРАДПАСЯЎНОЙ АПРАЦОЎКІ ГЛЕБЫ НА ЎРАДЖАЙНАСЦЬ ЯЧМЕНЮ

Перадпасяўная апрацоўка глебы з'яўляецца адным з важнейшых агратэхнічных прыёмаў, пры якім можна змяніць ход фізіка-хімічных і біялагічных працэсаў, што адбываюцца не толькі ў паверхневым, але і ва ўсім ворным слоі глебы [1, 2]. Для вывучэння ўплыву спосабаў перадпасяўной апрацоўкі глебы пад ячмень быў закладзены палявы доследі 1986—1987 гг. на дзярнова-падзолістай супясчанай глебе, якая падсцілалася марэнай з глыбіні 0,7—0,9 м на доследным полі ГСГІ.

Ворны слой доследных участкаў характарызуецца наступнымі аграхімічнымі паказчыкамі: pH_{KCl} 5,6—6,6, рухомага фосфару — 2—22, абменнага калію — 17—19 мг на 100 г глебы, колькасць гумусу — 1,6%.

Паўторнасць доследу чатырохразовая. Уліковая плошча дзялянкі 100 м². Папярэдніцай у доследзе была бульба. Пасля ўборкі папярэдняй

культуры праводзілі пераворванне доследнага ўчастка. Рана вясной пры надыходзе спеласці глебы праводзілі культывацыю на глыбіню 7—8 см.

Мінеральныя ўгнаенні ўносілі ў дозе $P_{60}K_{90}$. Апрацоўка глебы праводзілася згодна са схемай доследу: 1) пераворванне+прыкачванне; 2) культывацыя+баранаванне; 3) дыскаванне+прыкачванне; 4) культывацыя+прыкачванне; 5) РВК-3,6; 6) чызеляванне+прыкачванне.

Сяўбу праводзілі сеялкай СН-16 у агрэгаце з трактарам ДТ-25. Норма высеву 4 млн. шт. усходжых зярнят на 1 га. Насенне было пратраўлена байтанам. У фазе пачатку кушчэння ячменю праводзілі падкормку азотам у дозе N_{80}, апрацоўвалі пасевы сумессю аміннай солі 2,4Д—1,6 кг/га і базаграну — 0,5 кг/га. Уборка ячменю праводзілася прамым камбайнаваннем. Даныя ўраджаю апрацоўвалі метадам дысперсійнага аналізу па Б. А. Даспехаву па праграме, складзенай выкладчыкамі з удзелам студэнтаў.

Аналіз даных шчыльнасці глебы за 1986—1987 гг. паказвае, што ў час сяўбы ячменю найменшая велічыня яе ў прыёмах з пераворваннем і чызеляваннем, найбольшая — пры апрацоўцы агрэгатам РВК-3,6, асабліва ў 1987 г., калі вільготнасць глебы ў перыяд сяўбы складала 32%. Гэта пацвярджаецца даследаваннямі ў Літоўскай ССР і Смаленскай вобласці і данымі табл. 1.

Змяненне палявой усходжасці і захаванасці раслін да ўборкі залежыць ад метэаралагічных умоў года і ад прыёмаў перадпасяўной апрацоўкі глебы. У год з меншай колькасцю ападкаў (1986) пры чызеляван-

Таблица 1. **Змяненне паказчыкаў будовы ворнага слою (см) у залежнасці ад агратэхнічных прыёмаў перадпасяўной апрацоўкі пад ячмень (ад сяўбы да ўборкі)**

Спосаб апрацоўкі	Вільготнасць глебы, %				Аб'ёмная маса, г/см³			
	1986г.		1987г.		1986г.		1987г.	
	0—10	10—20	0—10	10—20	0—10	10—20	0—10	10—20
Пераворванне+прыкачванне	18,0 / 7,9	18,6 / 8,3	29,1 / 7,5	30,3 / 7,7	1,08 / 1,15	1,20 / 1,32	1,07 / 1,17	1,22 / 1,48
Культывацыя+баранаванне	15,1 / 7,8	16,0 / 8,8	29,0 / 7,8	29,8 / 12,2	1,10 / 1,20	1,90 / 1,49	1,09 / 1,26	1,52 / 1,56
Дыскаванне+прыкачванне	14,0 / 7,7	14,5 / 7,9	28,4 / 7,3	30,0 / 8,0	1,15 / 1,26	1,20 / 1,37	1,05 / 1,29	1,46 / 1,58
Культывацыя+прыкачванне	16,5 / 7,7	17,0 / 8,0	31,1 / 7,5	32,0 / 7,8	1,11 / 1,30	1,22 / 1,51	1,09 / 1,31	1,53 / 1,56
РВК-3,6	18,4 / 7,6	18,6 / 8,1	32,4 / 7,3	32,6 / 7,7	1,19 / 1,40	1,25 / 1,60	1,29 / 1,30	1,63 / 1,68
Чызеляванне+прыкачванне	15,1 / 7,0	15,3 / 7,1	30,6 / 7,9	30,6 / 7,9	1,00 / 1,05	1,11 / 1,22	1,09 / 1,09	1,24 / 1,39

Таблица 2. **Уплыў прыёмаў перадпасяўной апрацоўкі глебы за палявую ўсходжасць і захаванасць да ўборкі ячменю сорту Раланд**

Спосаб апрацоўкі	Колькасць усходаў на 1м², шт.		Палявая ўсходжасць, %		Захаванасць раслін да ўборкі		Захаванасць, %	
	1986г.	1987г.	1986г.	1987г.	1986г.	1987г.	1986г.	1987г.
Пераворванне+прыкачванне	260	339	65,0	84,7	205	314	78,8	92,6
Культывацыя+баранаванне	237	340	59,2	85,0	191	331	80,6	97,3
Дыскаванне+прыкачванне	234	292	58,5	73,0	195	216	83,3	74,0
Культывацыя+прыкачванне	282	301	70,5	75,6	249	252	88,3	83,7
РВК-3,6	300	294	75,0	74,0	214	210	71,3	71,4
Чызеляванне+прыкачванне	201	296	50,2	73,5	190	268	94,5	94,5